рэалізацыі розных і вельмі складаных шляхоў стварэння музеяў беларускай гісторыі.

1. *Гужалоўскі, А. А.* Уступны артыкул / А. А. Гужалоўскі // Музеі Беларусі : даведачнае выданне. – Мінск, 2008. – С. 3–56.

2. Іван Луцкевіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: be–tarask.wikipedia.org. – Дата доступу: 22.03.2016.

3. Medal na pamiątkę chrzte [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: yandex.by/images>. – Дата доступу: 22.03.2016.

К. Ф. ЛЫСАК

## ЭТНАКУЛЬТУРНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ ПРАДСТАЎНІКОЎ РОДУ ТЫШКЕВІЧАЎ

Нацыя нарадзілася ў выніку мадэрнізацыйных працэсаў XIX–XX стст. Істотнымі для разумення адметнасцей нацыянальнай ідэнтычнасці з’яўляюцца яе папярэднія этнакультурныя формы. Багатая гісторыка-культурная спадчына беларускіх зямель дазваляе прасачыць змяненне яе зместу на прыкладзе выдатных прадстаўнікоў шляхецкіх радоў, якія зрабілі значны ўклад у палітычнае, культурнае і эканамічнае жыццё Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай Імперыі, Польшчы, Літвы і Беларусі.

Сярод даследчыкаў няма адзінага меркавання адносна вызначэння паняцця нацыі. Прыхільнікі прымордыалісцкага падыходу, сярод якіх І. Г. Гердэр, І. Г. Фіхтэ і больш познія Л. М. Гумілёў, Ю. В. Брамлей, пастулююць эвалюцыяністкі характар развіцця этнасу, а нацыю лагічнай, больш дасканалай ступенню яго развіцця. На другім полюсе знаходзяцца канструктывісты (Э. Гелнер, Б. Андэрсан), якія звязваюць з’яўленне сучасных нацый, у першую чаргу, са зменамі ў палітыка-эканамічным становішчы еўрапейскіх і амерыканскіх краін у XVIII–XIX стст., пры гэтым асабліва падкрэсліваецца роля індустрыялізацыі. Некаторыя даследчыкі, пагаджаючыся з сучасным характарам нацый, звяртаюць увагу на ролю папярэдніх этнічных, лакальных і рэлігійных ідэнтычнасцей у фарміраванні нацыі [2, с. 12–13].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, на сённяшні момант нельга казаць пра агульнапрынятае разуменне тэрміну «нацыя» і паходжанне гэтай з'явы.

Даволі прадуктыўным, на нашу думку, з'яўляецца падыход амерыканскага сацыёлага Крэйга Калхуна, які ў сваіх працах свядома пазбягае вызначэння дадзенага паняцця, аналізу зместу і класіфікацыі нацый, а разглядае нацыянальныя рухі як аб'яднаныя агульным «дыскурсам»: тэмамі прыналежнасці да максімальна шырокай супольнасці ў межах адной дзяржавы і калектыўнай воляй у самастойным абранні сваёй улады [1, с. 22–23].

Такім чынам, атаясамленне індывіда сябе з пэўным сацыяльным цэлым, якое мае палітычнае, культурнае адзінства, і якое з'яўляецца крыніцай легітымнай улады, будзе лічыцца нацыянальнай ідэнтычнасцю.

На нашу думку, паняцце нацыянальнай ідэнтычнасці мае якасныя адрозненні ад ідэнтычнасці этнакультурнай. Нацыя ў сваім сучасным разуменні нараджаецца толькі ў XIX ст., а ідэя аб супадзенні культурных і палітычных межаў як умовы легітымнага існавання дзяржавы ў той час толькі пачала ўваходзіць у грамадска-палітычную думку.

Ва ўмовах феадальнага расслаення існаванне і падтрымка культурных адрозненняў была спосабам вертыкальнага і гарызантальнага адмежавання як ад сваіх суседзяў, так і ад прадстаўнікоў больш вышэйшых ці больш ніжэйшых класаў. Падчас нацыябудаўнічых працэсаў важнай стратэгіяй нацыянальнай эліты з'яўляецца «далучэнне» народу да сваёй культуры, ці стварэнне высокай культуры на аснове народнай. Этнакультурная ідэнтычнасць, як з'ява больш ранняя, уключае ў сябе атаясамленне з адносна вузкімі лакальна-культурнымі, рэлігійнымі, класавымі катэгорыямі, якія складаліся ва ўмовах буйных шматэтнічных імперый, феадальнага ладу, адсутнасці развітай сістэмы камунікацый, уяўляла сабою складаную структуру і магла перасякаць дзяржаўныя межы.

Такім чынам, аналіз этнакультурных і нацыянальных ідэнтычнасцей вядомых дзеячаў розных гістарычных перыядаў дазваляе выявіць асноўныя тэндэнцыі сацыякультурнага развіцця на беларускіх землях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прадстаўнікі роду Тышкевічаў у розныя часы выконвалі значныя ролі ў палітычным, грамадскім і рэлігійным жыцці Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Аналіз іх этнакультурных ідэнтычнасцей дапаможа разгледзіць усю шматузроўневасць і неадназначнасць дзяржаўных і нацыябудаўнічых працэсаў не толькі на беларускіх землях, але і ў суседніх Польшчы, Літве і Украіне. У якасці прыкладу канфлікту новага грамадска-палітычнага ўладкавання, пераўтварэнняў, звязаных з фарміраваннем сучасных нацый і этнакультурнай ідэнтычнасцю шляхты Рэчы Паспалітай, можна адзначыць Людвіка Скуміна-Тышкевіча. Ён актыўна бараніў старыя парадкі пасля прыняцця канстытуцыі 3 мая 1793 г., а пасля і наогул прысягнуў на вернасць Кацярыне ІІ. Безумоўна, з гістарычнага пункту гледжання, можна разглядаць гэтыя ўчынкі выключна як захады дзеля захавання свайго маёмаснага і сацыяльнага стану ў новых палітычных умовах. Але пры гэтым неабходна падкрэсліць, што для тагачаснай эліты, не толькі ў Польшчы, але і ў іншых манархіях, вызначальным для статусу з'яўлялася не набытае ўласнымі намаганнямі месца сярод роўных грамадзян, а прывілеі і паходжанне, род. Лаяльнасць была скіравана на асобу манарха, а не на дзяржаву, што дазваляла без цяжкіх псіхалагічных намаганняў перахадзіць з аднаго «двара» ў іншы.

Такім чынам, прыклад Людвіка Скуміна-Тышкевіча адлюстроўвае ўсю складанасць становішча кансерватыўна настроенай шляхты ў часы буйных сацыяльна-палітычных змен. Нараджаецца канфлікт паміж прыналежнасцю да прывілеяванага саслоўя і да нацыі.

Вызначальным паказчыкам ідэнтычнасці з'яўляецца самавызначэнне індывіда ці яго разуменне сябе ў культурнай, геаграфічнай і культурнай прасторы. Стваральнікі першага гісторыка-археалагічнага музею, які адлюстроўваў матэрыяльную і духоўную спадчыну нашага краю Канстанцін і Яўстах Тышкевічы, сваёй радзімай лічылі «Літву» і «Заходнюю Русь», што фактычна азначае Вялікае Княства Літоўскае ў складзе Рэчы Паспалітай, а пасля Расійскай імперыі. Паходжанне ад старажытных «рускіх» радоў і адначасовая прыналежнасць да польскай культуры (з відавочнымі рэгіянальнымі асаблівасцямі) сфарміравала ў братоў Тышкевічаў (як і ў іх шматлікіх сучасні-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каў) адчуванне сваіх адрозненняў ад «караняжаў» (шляхты цэнтральнай Польшчы). Гэты варыянт самаідэнтыфікацыі, які атрымаў назву «Gente lituanus, natione polonus», лёг у аснову генеалогіі беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці: шмат маладых шляхцічаў мясцовага паходжання, усведамляючы сваю асаблівасць, прасякнутыя ідэямі рамантызму, звярнуліся да вывучэння асаблівасцей тутэйшай культуры, што спрыяла асэнсаванню беларускага народа ў якасці самастойнага гістарычнага і культурнага суб'екта.

Такім чынам, шматграннасць этнакультурных працэсаў на мяжы XVIII–XIX стст. спрыяла фарміраванню ў асяродку шляхты былой Рэчы Паспалітай ідэі культурнай, а ў наступным і палітычнай, самастойнасці прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва: беларусаў, літоўцаў, украінцаў. Гэта выяўлялася ў цікавасці да іх матэрыяльнай і духоўнай спадчыны, традыцый, гісторыі і мовы, што пазней выявілася ў сістэматычных навуковых даследаваннях.

Нашчадкі роду Тышкевічаў і іншых шляхецкіх радоў, якія жылі на мяжы XIX–XX стст. нярэдка з'яўляліся носьбітамі адразу некалькіх ідэнтычнасцей. Так, пакручасты жыццёвы шлях графа Міхаіла Тышкевіча (1857–1930) яскрава адлюстроўвае гэту тэндэнцыю: нарадзіўся ў сям'і паланізаванай шляхты, якая вядзе свой радавод ад эліты Вялікага Княства літоўскага, узрос у атачэнні ўкраінскіх сялян на кіеўшчыне, вучыўся ў варшаве, Вільне, Санкт-Пецербургу на мастака, стаў актыўным прыхільнікам і ўдзельнікам украінскага культурнага жыцця, і ў рэшце дзеячам УНР. Пры гэтым, жывучы на Захадзе, ён прымаў актыўны ўдзел у каталіцкім жыцці.

Такім чынам, можна канстатаваць шматузроўневасць, а часам і супярэчлівы характар этнакультурнай ідэнтычнасці як Міхаіла Тышкевіча, так і яго сучаснікаў, якія прынялі непасрэдны ўдзел у «нацыянальным адраджэнні» паднявольных народаў. Выхаваны ў асяродку высокай польскай каталіцкай культуры, падданы Расійскай імперыі, ён, спярша ў духу ідэй асветніцтва і «бацькаўскага» стаўлення да падпарадкаваных яму і яго сям'і сялян, выяўляў цікавасць да ўкраінскай культуры, мовы. Істотныя геапалітычныя і сацыякультурныя пераўтварэнні ў тагачаснай Еўропе прымусілі яго перайсці ад асветніцка-культурнай дзейнасці (друк, падтрымка ўкраінскіх пісь-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

меннікаў, мастакоў, абарона мовы) да палітычнай. На практыцы для многіх прадстаўнікоў тагачасных рухаў падобныя перамены былі псіхалагічна нялёгкай з'явай: адмова ад больш прэсціжнай шляхецкай польскай ідэнтычнасці на карысць украінскай (у іншых выпадках літоўскай, беларускай), якая яшчэ не валодала развітай высокай культурай, шчыльна асацыявалася з «простым людам», патрабавала істотных намаганняў, прынцыпова іншага ладу мыслення і светапогляду.

Падобныя складнасці ўзнікаюць у выпадку з Бенядзіктам Генрыкам Тышкевічам (1852–1935), фатографам, дзякуючы якому мы можам паглядзець на жыццё як арыстакратыі, так і простых беларусаў у канцы XIX – пачатку XX ст. Нягледзячы на шчыльнае сумеснае жыццё побач з беларусамі і літоўцамі, па ладу жыцця і па культуры ён быў тыповым прадстаўніком польскай інтэлігенцыі. Можна прасачыць ускосную сувязь Бенядзікта Тышкевіча з літоўскай ідэнтычнасцю – сваю яхту, на якой ён выправіўся на Сусветную прамысловую выставу ў Філадэльфіі, ён назваў «Жамойція».

Такім чынам, нават у пачатку XX ст., калі нацыянальная ідэя моцна заявіла аб сябе і пачала спрыяць істотным палітычным, эканамічным і сацыяльным зменам у жыцці тагачасных дзяржаў, шэраг прадстаўнікоў шляхты працягваў прытрымлівацца кансерватыўных поглядаў. Яны захоўвалі і культывавалі ў сваім атачэнні, сямейным асяродку памяць аб старым укладзе, прывілеяваным становішчы іх радоў у часы Рэчы Паспалітай. Гэта выяўлялася ў тым ліку ў падкрэсленай культурнай адасобленасці ад беларускіх і літоўскіх сялян.

Сёння, калі нацыянальныя дзяржавы сталі аб'ектыўнай рэальнасцю палітычнай карты свету, а нацыянальная культура ў межах сваёй краіны транслюецца праз развітую камунікацыйную сетку, сучасныя Тышкевічы пераважна ідэнтыфікуюць сябе ў залежнасці ад краіны свайго нараджэння і жыцця (напрыклад польская актрыса, дзеячка культуры і мастацтва Беата Тышкевіч).

Такім чынам, можна сведчыць аб вызначальнай ролі сучасных нацыянальных дзяржаў у фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці і дэканструяванні былых этнакультурных ідэнтычнасцей з захаваннем пэўнай пераемнасці з апошнімі. Этнакультурная, а ў наступным і нацыянальныя ідэнтычнасць прад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стаўнікоў роду Тышкевічаў прымаюць розныя формы і змест у розныя гістарычныя перыяды. Адлюстраванне дынамікі дадзеных ідэнтычнасцей дазваляе вылучыць галоўныя фактары іх фарміравання: сацыяльнае паходжанне, род, рэлігія ў перыяд феадальнага ладу. Роля дзяржавы не мела вызначальнага ўплыву: трансляцыя і перадача культурнага вопыту ажыццяўлялася ў сваім сацыяльным асяродку праз лакальныя вертыкальныя і гарызантальныя сувязі. Палітычная лаяльнасць шляхты была скіравана, у першую чаргу, на асобу манарха, а не на дзяржаву. Сітуацыя канца XVIII – пачатку XIX ст. з нараджэннем нацыянальных рухаў, разбурэннем феадальнага ладу, буйных імперый выклікала крызіс былых этнакультурных ідэнтычнасцей: у межах аднаго пакалення адбылася карэнная ломка ўяўленняў аб сваіх культурных характарыстыках, што паспрыяла паўстанню нацыянальнай беларускай, літоўскай, польскай і ўкраінскай інтэлігенцый, далей народжаныя нацыянальныя ідэнтычнасці актыўна канструяваліся і падтрымліваліся дзяржавай.

---

1. *Калхун, Крейг.* Национализм / Крейг Калхун. – М. : Территория будущего, 2006. – 288 с.

2. *Сміт, Э. Д.* Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі / Э. Д. Сміт. – Мінск : Беларускі Фонд Сораса, 1995. – 270 с.

А. М. НАРОЎСКАЯ

## СЕМІЁТЫКА КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ ЛАГОЙШЧЫНЫ

У міфалагічных тэкстах адзначаецца, што мадэль любога грамадства імкнецца знаходзіцца на тэрыторыі асвоенай і арганізаванай прасторы. Міфапаэтычны свет заўжды мае межы, якія надаюць яму ўстойлівасць і бяспеку. Чым больш маркіраваных кропак і межаў, тым больш асвоенай і структураванай з'яўляецца «свая» прастора. Тэрыторыя вёскі, мястэчка, на якой пражывала абшчына, звычайна мела свае межы – умоўныя альбо маркіраваныя прыдарожнымі крыжамі, камянямі альбо загароджаю. Гэтая прастора ўспрымалася як родная, «свая». Людзі добра ведалі межы сваёй тэрыторыі; за яе межамі пачы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ